


## У НУМАРЫ

| ***Навіны*** | ***Навуковая праца*** |
| --- | --- |
| **З інтарэсам да маляванкі** | **Заслаўе ў беларускай культуры** |
| **Выстава карцін Валерыя Юзвука** | **Обращаясь к мифологии предков: русалки** |
| **У музеі тэлканал “Беларусь-2”** | **Вядомыя жанчыны заслаўскай зямлі** |
| **Наши ковры в Гомеле** | |

## ***Навіны***

### З інтарэсам да маляванкі

1-га сакавіка ДУ “Гісторыка-культурны музей-запаведнік “Заслаўе” прыняў удзел у Рэспубліканскім майстар-класе **“Беларускі народны дэкаратыўны роспіс: традыцыі і сучаснасць”**, які праводзіўся на базе Установы адукацыі *“Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі”* Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Музей-запаведнік прадставіў лекцыю “Дыван-маляванка як з’ява ў беларускай народнай мастацкай культуры”, у межах якой былі раскрыты чатыры асноўныя блокі: 1) сутнасць мастацкага накірунку; 2) аўтары і іх працы; 3) сучаснасць дывана-маляванкі; 4) Музей беларускай маляванкі ў Заслаўі.

У межах працы майстар-класа былі наладжаны кантакты з майстрамі, якія прафесійна займаюцца роспісам у народным стылі па дрэве, шкле і тканіне, навучаюць гэтай справе дзяцей у розных куточках Беларусі. Спадзяемся, што ў далейшым мы наладзім з імі плённую супрацу на базе Музея беларускай маляванкі.

Усе ўдзельнікі майстар-класа мелі магчымасць пазнаёміцца з выставай “Чароўныя ўзоры”, арганізаванай на базе Нацыянальнага цэнтра

мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, дзе былі прадстаўлены дзіцячыя работы, створаныя ў стылі народнага роспісу тканіны, дрэва і шкла. Гэта былі лепшыя творы выхаванцаў Цэнтраў творчасці дзяцей і моладзі з усёй Беларусі.



*Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, г. Мінск.*
*Рэспубліканскі майстар-клас. За працай*



*Дзіцячыя работы на выставе “Чароўныя ўзоры”.*
*У цэнтры – работа “Куфэрак Карэліцкай паненкі”, выкананая Ульянай Розінай (вучаніцай ДУА “Карэліцкі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”)*

## Выстава карцін Валерыя Юзвука

З 2-га сакавіка да 4-га красавіка ў зале часовых выстаў музея-запаведніка адбывалася выстава карцін мастака **Валерыя Сцяпанавіча Юзвука (Yuzvuk Valery Stsyapanavitch, 1952 – 2009)**. У межах выставы выстаўляўся шэраг алейных работ у жанры пейзажа і нацюрморта, адна работа (аўтапартрэт) – у партрэтным жанры.

Валерый Юзвук – вядомы беларускі мастак, які паходзіў родам з г. Мінска, на працягу многіх гадоў быў сябрам Беларускага саюза мастакоў (БСМ). Карціны Валерыя Юзвука захоўваюцца як у шэрагу айчынных калекцый, так і ў замежных, належаць як установам, так і прыватным асобам.



*Валерый Юзвук. “Лістапад”, палатно, алей, 2003 г.*

Сярод работ, прадстаўленых на выставе, вылучаўся аўтапартрэт, у якім аўтар выявіў сябе, апранутым у строй заможнага шляхціча або магната, характэрны для XVI – XVII стст. – своеасаблівая асацыяцыя-пераўвасабленне ў эпохах.

Дадзены аўтапартрэт адмысловым чынам быў размешчаны ў нішы ў якасці цэнтра, які паядноўвае ў адной сэнсавай плыні ўсе прадстаўленыя ў зале карціны. Дадаткова ён аздоблены работамі, выкананымі *Аляксандрам Кісялёвым* – майстрам па мастацкай апрацоўцы метала. Гэта дасканала

адкаваныя са сталі ружы і нажы (“куячкі”), якія нібыта паядналіся з каларытам старажытнай эпохі, сталі яе матэрыяльнай візуалізацыяй.



*Валерый Юзвук. Эцюд, кардон, алей, 2001 г.*

**У музеі тэлканал “Беларусь-2”**

У Заслаўе 3-га сакавіка завітала здымачная група тэлеканала “Беларусь-2”, у межах падрыхтоўкі відэасюжэта для тeлепередачы “Камень, ножницы, бумага”. Карэспандэнтка **Алеся Баярскіх** наведала этнаграфічны комплекс нашага музея-запаведніка, дзе яе ў будынку млына, а таксама – у хаце “завознікаў” суправадзілі нашы супрацоўнікі.

Далей, у межах горада, здымачная група працавала на гарадзішчы “Замачак” (“Замэчак”), на Заслаўскім замку або гарадзішчы “Вал”, пры Кафедральным Саборы Праабражэння Господня, пры помніку князю Ізяславу (скульптар – *Аляксандр Прохараў*) на Рынкавай плошчы, а таксама – скульптурнай кампазіцыі, прысвечанай Рагнедзе і Ізяславу (скульптар – *Анатоль Арцімовіч*), размешчанай побач з ГДК “Світак”.

Прыемна, што прадстаўнікі нашага тэлебачання чарговы раз выказалі шчыры інтарэс і павагу да старажытнага Заслаўя, стварылі для гледачоў чарговую візуалізацыю яго сучаснасці, паяднанай з мінуўшчынай. Мы

ўдзячны тэлеканалу “Беларусь-2” за такую добрую і ва ўсіх сэнсах карысную працу па адкрыцці здабыткаў гістарычнай і культурнай спадчыны Заслаўя як неад’емнай часткі гістарычнай і культурнай спадчыны нашай краіны.




*Застаўка перадачы “Камень, ножницы, бумага”, тэлеканал “Беларусь-2”*

**Наши ковры в Гомеле**

С 22 февраля по 26 марта в Картинной галерее Г. Х. Ващенко в Гомеле проходила выставка расписных ковров из фондов историко-культурного музея-заповедника “Заславль”. Для проведения выставки было передано 27 ковров.

В экспозиции были представлены все три известные на сегодняшний день сюжета наивной художницы со Случчины **Алены Киш**: *“Рай”, “Дева на водах”, “Письмо к любимому”*. Целый зал галереи заняли ковры **Язепа Дроздовича**, в их числе такие шедевры как “*Театральный”, “Музыканты”, “Лунная ночь”*, *“Лис с совой”* и другие.

Посетители выставки смогли увидеть произведения не только упомянутых выше известных авторов, но и ковры и макатки **Фёдора Суховилы, Сергея Шурпика, Таисии Клоповой**, а также ковры неизвестных авторов из народа.

Большинство работ, представленных на выставке, происходит с территории Витебской области, но есть здесь и ковры из Наровлянского района Гомельской области (*“Голуби с поречками”*), а также ковры

**Никанора Зосика**, который жил в Дрогичинском районе Брестской области – *“Горное озеро” и “В деревне”*.




*Афиша к выставке “Беларускія маляванкі”.*
*Подготовлена Галереей Г.Х. Ващенко в г. Гомеле*

*Ирина Артемьева,*
*ст. н. с. отдела фондов*

## ***Навуковая праца***

### Заслаўе ў беларускай культуры

У студзеньскім нумары нашай газеты (№ 33) мы пісалі пра роднасныя сувязі князёў Заслаўскіх – уласнікаў Заслаўя ў XIV – XVI стст. – з дынастыяй вялікіх князёў літоўскіх, а менавіта – Гедзімінавічаў. У гэтым нумары вырашылі працягнуць пісаць аб вядомых асобах, непасрэдна звязаных з Заслаўем. У ліку такіх асоб асабліва вылучаецца постаць асветніка, прапаведніка, грамадскага дзеяча і аўтара кніг **Сымона Буднага** (каля 1530 – 1593) . Ён з'яўляецца гістарычнай асобай, вядомай не толькі ў нас, але і ў краінах Заходняй Еўропы, асобай, якая пакінула свой след як на старонках айчыннай, так і сусветнай гісторыі. Менавіта пра Сымона Буднага і яго сувязь з Заслаўем і павядзём ніжэй гутарку.

Сымон Будны па веравызнанні быў пратэстантам і ўсвядомлена падтрымліваў плыню пратэстантызму на працягу ажыццяўлення ўсёй сваёй актыўнай стваральнай працы. Так, напрыклад, працаваў ён прапаведнікам (пастарам) у Вільні, дзе падрыхтаваў матэрыялы да першай сваёй друкаванай кнігі – *“Катэхізіса”*, якая выйшла ў 1562 г. у Нясвіжы пад патранатам князёў *Радзівілаў*. Фактычна, гэта была першая друкаваная кніга ў межах сучаснай тэрыторыі Беларусі: вядома, што нашым першадрукаром бясспрэчна з'яўляецца *Францыск Скарына*, але ён свае кнігі друкаваў у Празе і ў Вільні. Будны быў актыўным удзельнікам дыспутаў, у межах якіх уступаў у гарачыя спрэчкі з каталікамі, у тым ліку – з дамініканцамі і езуітамі, якія лічылі яго “ерэтыкам” і абяцалі яму пасля смерці трапленне ў пекла з кіпучай смалой.




*Сымон Будны. Літаграфія з ліку работ аўтарства В. і Л. Варэцаў*

Біяграфія Сымона Буднага вельмі багатая і насычаная падзеямі, аб ёй можна даведацца з энцыклапедый, разнастайных навуковых і навукова-папулярных артыкулаў, іншых крыніц. Зараз жа, зрабіўшы пэўную агульную замалёўку аб ім, звернемся непасрэдна да сувязі гэтай гістарычнай асобы з Заслаўем, зазначыўшы адразу, што гэтая сувязь была ўсталявана дзякуючы клопату **Яна Янавіча Глябовіча**.

Князь Ян Янавіч Глябовіч (1544 – 1590) – уласнік Заслаўя і ваколіц – паходзіў з заможнага шляхецкага роду. Як тады было традыцыйна прынята ў Вялікім Княстве Літоўскім у асяродку заможнай шляхты, Яна Янавіча яшчэ ў юнацкім узросце адправілі навучацца ва ўніверсітэтах Заходняй Еўропы,

дзе ён не толькі навучаўся розным грамадскім навукам, але і паслужыў пры двары імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі, набыўшы ўменне і ў ваеннай справе. Менавіта тады Ян Янавіч Глябовіч і ўспрыняў пратэстантызм, папулярны ў той час у Заходняй Еўропе, і вярнуўся дадому ўжо пратэстантам. Па вяртанні на Радзіму ім быў узведзены кальвінскі збор (зараз – Кафедральны сабор Праабражэння Гасподня) ў Заслаўі, а таксама – у Менску (сталіцы Менскага ваяводства; храм не захаваўся). Тады ж Янам Янавічам у Заслаўе для жыцця і працы і быў запрошаны Сымон Будны, да паслуг якога была прапанавана друкарня, паперня (мануфактура па вырабу паперы), княская бібліятэка.




*Сымон Будны. Карыкатура каталіцкага друку XVI ст.*

Згодна з рознымі сведчаннямі, Сымон Будны пражыў у Заслаўі ад некалькіх месяцаў да двух гадоў. У гэты час ён прапаведваў, а таксама займаўся перакладам *Бібліі*, карыстаючыся, у тым ліку, тэкстамі на старажытнагрэцкай і старажытнаяўрэйскай мовах. Па гэты час у навуковай супольнасці маюцца спрэчкі па месцы выдання перакладу Бібліі, здзейсненым Сымонам Будным: некаторыя лічаць, што ён пабачыў свет у Заслаўскай друкарні, некаторыя мяркуюць, што яна была надрукавана ва Уздзе. Сумненняў не выклікаюць два факты: той, што прадмова да перакладу дакладна была падрыхтавана Будным у Заслаўі, а разам з ім яшчэ і той, што значны масіў матэрыялу, выкарыстаны пры друку, ім быў прапрацаваны менавіта ў час яго жыцця і працы пад апекай Яна Янавіча Глябовіча ў Заслаўі.

Як ужо адзначалася вышэй, Сымон Будны быў вядомы ў Вялікім Княстве Літоўскім, ва ўсёй Рэчы Паспалітай, а таксама – у шэрагу краін Заходняй Еўропы, з'яўляючыся заўважным прадстаўніком асветніцкай думкі таго часу, на працы якога спасылалася навуковая супольнасць. Факт жыцця і творчасці дадзенай гістарычнай асобы ў Заслаўі, асобы, якая была

сапраўднай з'явай у гісторыі і культуры Беларусі, выступае ў якасці чарговага пацвярджэння высокай каштоўнасці Заслаўя ў рэчышчы гісторыка-культурнай спадчыны нашай Айчыны.

**Обращаясь к мифологии предков: русалки**

Мифология народа – это своеобразное отражение его верований и представлений о мире, его устройстве, складывавшихся на протяжении веков и передававшихся из поколения в поколение. *Мифология имеет очень древние, дохристианские корни.* Даже сейчас в нашем белорусском обществе, по основе своей являющимся христианским, сохраняется немалое число языческих черт, происходящих из недр народной мифологии. Просто мы очень редко об этом задумываемся. Касается это и различных сверхъестественных мифологических существ, о которых мы знаем с детства из сказок. Среди них особое место занимают **русалки**, являющиеся одним из известнейших персонажей мифологии не только нашего, но и многих других народов.

Если Вы были на экскурсии в нашем Детском музее мифологии и леса, то среди множества лесных обитателей рядом с камнем, на котором разместился *Ужиный или Змеиный Царь (Вужыны, Змяіны Цар)*, на ветке дерева Вы наверняка замечали небольшую белую куклу, изображающую девушку-русалку. Наши предки верили в существование русалок. Важно не путать их с другими мифологическими существами, например, с *Озерницами (Азярніцамі)*, которые водились в глубоких чёрных озёрах и относились к злым духам нашей мифологии, наряду с *Багником (Багнікам)*, *Оржавенником (Аржавеннікам) и Болотником (Балотнікам*), хитростью приманивающими людей и животных, чтобы затащить их в своё болото и погубить. С этими злыми духами не в силах был справиться даже *Перун*.

Считалось, что после русальной недели русалки выходили из воды и качались на деревьях. Находиться на земле они могли ровно столько, пока не высохнут их волосы. Русалки охотились на молодых красивых парней, зачаровывая их своими колдовскими глазами, чтобы затем утащить свою жертву под воду или защекотать до смерти. Особенно русалки старались навредить влюблённым парам, завидуя им. Однако, не всегда от них исходил вред. Так, например, считалось, что если мужчина освободит русалку, запутавшуюся волосами в ветвях дерева, то она последует за ним домой и станет прилежной хозяйкой. Верили, что защититься от русалок возможно было с помощью железной булавки: уколов одну из-них булавкой, можно было заставить разбежаться целый гурт русалок, но для этого

человеку нужно было не смотреть им в глаза, чтобы не попасть под их чары и не стать их безвольной жертвой. Также, чтобы спастись от русалок, можно было начертить на земле крест, очертив его кругом, и находиться внутри данного круга.



*Русалка ў экспазіцыі Дзіцячага музея міфалогіі і лесу*

Считалось, что после *Пасхальной седмицы* русалки могли свободно ходить по лугам, полям и рощам, входить в деревни. В это время они встречались людям чаще всего. Для того, чтобы обезопасить себя от этих встреч, наши предки проводили обряд под названием *“Проводы русалки”*. На роль “русалки” выбирали самую красивую незамужнюю девушку, наряжали её и устраивали гуртом праздничные проводы к житнему полю. Наши предки были уверены, что сие действо отвадит большинство русалок от встреч с людьми.

Верили, что русалками становились дочери, проклятые своими родителями ещё в утробе матери, а также те, кто погиб в воде, не будучи крещёным, а ещё – молодые утопленницы, покончившие с собой в воде. Под “водой” имеются ввиду различные водоёмы, чаще всего – озёра и пруды (сажалки, ставки). Самым известным озером русалок в Беларуси является *озеро Литовка*, находящееся неподалёку от Новогрудка. Данное озеро известно всему миру благодаря тому, что оно получило своё поэтичное отражение в произведении *Адама Мицкевича “Гражина”*. Верят, что в водах Литовки утонуло немало девушек, не желавших жить в браке без любви. Также наши предки считали, что немалое количество русалок существовало в *озере Нарочь* – самом крупном озере Беларуси.

По сей день о русалках не забывают, не только благодаря сказкам, поэмам, песням, картинам и прочим произведениям, в которых отразились народные представления об этих мифических существах, но и благодаря историям, передающимся в разных местностях Беларуси из уст в уста, свидетельствующих о том, что интерес к русалкам сохранился, являясь одним из неистлевших следов мифологического восприятия мира, а также подтверждением того, что русалочья тематика стала органической частью не только традиционной, но и современной культуры.

*Литература*

*1. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап. – Мн. : Беларусь, 2006. – 599 с. : іл.*

*2. Шамак А.А. Міфалогія беларусаў / А.А. Шамак. – Мн. : Інстытут культуры Беларусі, 2013. – 256 с.*

*3. Русалки, вампиры и привидения: топ-5 мистических мест Беларуси [Электронный ресурс] // Портал новостей Гомельской области. – Режим доступа: https://progomel.by/society/travels/2019/10/837522.html. – Дата доступа: 02.03.2023.*

*4. Русалки без хвоста, ухающий Шеша и Возила с конской головой: какими были белорусские боги и духи [Электронный ресурс] // новостной портал Смартпресс. – Режим доступа: https://smartpress.by/idea/istoriya/15163/. – Дата доступа: 02.03.2023.*

*Ирина Артемьева,*
*ст. н. с. отдела фондов*

*Звяртаемся да часу, калі наш музей-запаведнік выступаў у якасці арганізатара і мадэратара канферэнцый. Яны адбываліся на працягу шэрагу гадоў. Ад іх працы захаваліся даволі цікавыя матэрыялы, якія друкаваліся ў спецыяльных зборніках. У гэтым нумары мы хочам Вам прапанаваць адзін з такіх матэрыялаў, які быў надрукаваны ў зборніку* “Заслаўе. Карані нашага радаводу” *у 2011 г., па выніках канферэнцыйнай дзейнасці, разгорнутай нашым музеем-запаведнікам і падтрыманай навуковай і краязнаўчай грамадскасцю. Звернемся да следу прыгожай паловы роду чалавечага ў нашай гісторыі, на аснове артыкула малодшай навуковай супрацоўніцы Інстытута гісторыі НАН Беларусі* ***Л.П. Собалевай****, які падаем амаль без змяненняў, апрача дадавання вылучэнняў (курсіў, тлусты шрыфт), звязаных з імёнамі гістарычных асоб, і выявы гербавай кафлі. Ілюстрацыя і вылучэнні дададзены згодна з адзначанай тэматыкай, адпаведна меркаванню рэдкалегіі газеты [рэд.].*

## Вядомыя жанчыны заслаўскай зямлі

У 1970-х гадах у сусветнай гістарычнай навуцы з'явілася гістарычная феміналогія, якая паставіла сваёй задачай прыцягненне ўвагі да гісторыі

жанчыны. Ва ўсе часы жанчыны неслі ў свет прыгажосць і новае жыццё. Яны ўносілі ў адносіны паміж дзяржавамі, пакуль мужчыны ішлі вайной адзін на аднаго, мір і спакой, замацоўвалі гэты мір дынастычным шлюбам, былі шчаслівымі ў гэтым шлюбе ці марнелі ў ролі нялюбай жонкі, нараджалі і выхоўвалі нашчадкаў, станавіліся маці магутных дынастый ці палітычных дзеячаў... У вялікім спісе нашых знакамітых суайчынніц і вядомыя заслаўскія жанчыны.

**Ганна Фёдараўна Заслаўская** (? – 1571), апошняя з Заслаўскіх. Яе бацька – **Фёдар Іванавіч** (каля 1470 – 1538 гг.) быў намеснікам віцебскім, з 1494 па 1499 гг. – намеснікам бранскім, з 1501 па 1538 гг. – старастам і дзяржаўцам аршанскім. Маці – **Соф'я Андрэеўна Сангушка**, пляменніца славутага палкаводца і вялікага гетмана *Канстанціна Астрожскага*. Сястра Ганны памерла рана, і ёй дасталіся ўсе маёнткі бацькоў, у тым ліку з трэцяй часткай Заслаўя і замка (горад быў падзелены паміж 9 уласнікамі, нашчадкамі братоў бацькі – *Міхаілам і Багданам*, найбольш значнай была доля Ганны Фёдараўны).



*Кафля з адбіткам сумеснага герба Я. Глябовіча і К. Кратоўскай, XVI ст.*
*Выяўлена Заслаўскай археалагічнай экспедыцыяй у 1980-х гг.*
*Захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі*

У 1537 г. Ганна Фёдараўна выйшла замуж за **Яна Юр'евіча Глябовіча** (? – 1549 гг.), з 1546 г. – канцлера Вялікага Княства Літоўскага. Заснавальнік

роду **Глеб** быў родзічам *Івана Вяжэвіча* – баярына, даволі вядомага ў сярэдзіне XV ст. Дакладна паходжанне *Вяжэвічаў і Глябовічаў* не вызначана, але існуе меркаванне, што яны паходзяць з баярства Смаленскай зямлі, далучанай да Вялікага Княства Літоўскага на мяжы XIV – XV стст. [8, s. 40-45].

Глябовічы даволі рана (у 2-й палове XV ст.) прынялі каталіцтва. Іх узвышэнне было імклівым. Ужо ўнук Глеба, Ян Юр'евіч, заняў пасля *Альбрэхта Гаштаўта [Альбрэхта Гаштольда – рэд.]* пасады канцлера і віленскага ваяводы. Аднак маёмасныя ўладанні яго не былі такімі ж вялізнымі, як у *Радзівілаў, Кезгайлаў, Гаштаўтаў [Гаштольдаў – рэд.].* Паўторны шлюб з Ганнай Фёдараўнай Заслаўскай прынёс яму Заслаўе пад Менскам, Межава пад Оршай, сваяцкія сувязі з *Гедымінавічамі*, зрабіў яго буйным феадалам і дазволіў зрабіць бліскучую кар'еру. Пазней Ян Глябовіч атрымаў у пажыццёвае карыстанне буйныя староствы Барысаўскае і Бабруйскае. Імкнучыся падкрэсліць сваю веліч, Глябовіч наўмысна падбіраў у кола сваіх прыдворных “прыродных князёў” са здрабнелых праваслаўных родаў: *Адзінцэвіча, Бароўскага, Пузыну*. Свой уласны двор Ян Глябовіч наладзіў накшталт каралеўскага, у Вільні меў палац, пры якім утрымліваўся звярынец з экзатычнымі жывёламі. Ад шлюбу з Ганнай засталіся **сын Ян** і **тры дачкі – Гальшка, Барбара і Дарота**.

Ганна Фёдараўна выхоўвала дзяцей практычна самастойна (сыну не было і 5 гадоў, калі памёр бацька), акрамя таго, дбала і пра Заслаўе. Дзякуючы далучэнню частак горада, якія належалі яе стрыечным сёстрам, *Марыі і Настассі Мсціслаўскім*, да 1560 г. увесь горад і ўвесь замак належаў толькі ёй. Пры апошніх Заслаўскіх горад расквітнеў: пашырылася гарадская тэрыторыя, цэнтрам яго стала гандлёвая плошча, новы штуршок атрымалі рамёствы, асабліва ганчарнае [1, с. 124]. З сярэдзіны XVI ст. на рацэ Свіслач дзейнічаў заслаўскі млын. Усе гэтыя змены адбываліся ў тым ліку і дзякуючы гаспадарчай дзейнасці і амбіцыям Ганны Фёдараўны. Тым больш узорам была *каралева Бона Сфорца* (1494 – 1557 гг.), прыхільнікам палітыкі якой пэўны час з'яўляўся муж Ганны Фёдараўны, жанчына разумная, энергічная і дальнабачная – дзеля ўзмацнення палітычнай улады свайго мужа інтэнсіўна павялічвала ўласныя зямельныя ўладанні, стала ініцыятарам аграрнай рэформы 1557 г., якая ўвайшла ў гісторыю як “Валочная памера”. Ёсць падставы меркаваць, што яны былі знаёмыя. *Вялікі князь Жыгімонт І* высока цаніў адданасць Глябовічаў: на сённяшні дзень вядомыя 2 прывілеі на полацкае ваяводства за першую палову XVI ст., адзін з іх – прывілей Яну Юр'евічу 1532 г. Жыгімонт І надае ваяводства Я. Глябовічу: за заслугі яго продкаў перад продкамі Жыгімонта; за заслугі

самога Я. Глябовіча перад вялікім князем, і “втраты знаменитыи прыимовалъ” у прывілей Глябовічу ўнесены такі аргумент, як просьба каралевы Боны ўзнагародзіць за старую службу і заахвоціць да новай [3, с. 22-23].

Польскі даследчык *Ю. Вольф* у генеалагічным зборніку прыводзіць шэраг запісаў, якія характарызуюць Ганну Фёдараўну даволі самастойнай жанчынай: яна заключала дагаворы, пазычала і купляла маёмасць, абараняла маёмасныя правы сваіх дзяцей [6, s. 591-594]. Трэба адзначыць, у XVI ст. жанчыны ВКЛ мелі значна больш правоў, чым жанчыны вышэйшага грамадства ў іншых еўрапейскіх краінах. Высокі статус ім забяспечвала ўласная маёмасць і права распараджацца ёю. Адносна асабістых чалавечых якасцей Ганны Фёдараўны, пра якія замоўчваюць крыніцы, сведчыць тэстамент яе сына, **Яна Глябовіча**. Сваіх сыноў ён просіць шанаваць маці (жонку Яна Янавіча Глябовіча – Кацярыну Кратоўскую): “...каб вы матульку сваю ў вялікай пашане мелі, бо яна вас нарадзіла, выхавала і старанна вам з маленства вашага служыла...” [5, с. 60-67]. Паколькі ўнутраны лад жыцця сям'і трымаўся ў тагачасным грамадстве на жанчыне, таму і дзеці наследавалі лепшыя рысы характару маці і перадавалі ў сваю чаргу наступнаму пакаленню.

У 1562 г. Ганна Фёдараўна ў другі раз выйшла замуж – за польскага *князя Іераніма Сіняўскага*, аснову маёмасці яе сына Яна Янавіча, графа на Дуброўне і Заслаўі, склалі бацькоўскія маёнткі князёўны Заслаўскай.

Род Глябовічаў зрабіў значны ўклад у гісторыю Вялікага Княства Літоўскага. Ян Янавіч Глябовіч, знакаміты дзяржаўны дзеяч, быў менскім кашталянам у 1571 – 1585 гг. Менавіта пры ім з 1581 г. у Менску пачалі праводзіцца пасяджэнні Трыбунала ВКЛ, што садзейнічала ўзвышэнню палітычнай ролі горада і яго эканамічнаму развіццю, будучы гарачым прыхільнікам пратэстантызму, заклаў кальвінісцкі збор у Заслаўі. Пры ім горад стаў культурным асяродкам краю: пэўны час тут жыў і працаваў Сымон Будны, у горадзе была наладжана вытворчасць паперы [2, с. 54].

Бацькоўскія маёнткі дазволілі тром пакаленням Глябовічаў трымацца ў ліку найбуйнейшых дзяржаўных дзеячаў. Род іх абарваўся са смерцю *Ежы Караля Глябовіча* ў 1669 г. Адна з яго дачок і прапраўнучак Ганны Фёдараўны Заслаўскай – *Крысціна Барбара Глябовіч* – выйшла замуж 12.06.1667 г. за *Казіміра Паўла Яна Сапегу* (1642 – 13.3.1720), а паколькі другая дачка дзетак не мела, усе маёнткі Глябовічаў, у тым ліку і Заслаўскае графства, перайшлі ў маёмасць *Сапегаў* [7, s. 336-356]. У 1676 г. яны заснавалі ў Заслаўі кляштар дамініканцаў, пры якім былі шпіталь,

школа і бібліятэка. Паводле вопісу інвентара 1796 г., яе фонд налічваў больш за 300 тамоў [4, с. 70].

Муж Крысціны Барбары меў выдатную адукацыю: вучыўся ва ўніверсітэтах Граца і Лівена, зрабіў бліскучую кар'еру: ад падскарбія надворнага ВКЛ да вялікага гетмана літоўскага. Выхаванне дзяўчынак у тагачасным грамадстве было пастаўлена па-іншаму: іх вучылі пісьму, чытанню, рэлігійным законам, большая ўвага надавалася ў выхаваўчым працэсе фарміраванню такіх якасцей, як цнатлівасць, рэлігійнасць і гаспадарлівасць. Мецэнацкая дзейнасць Крысціны Барбары сведчыць аб дастатковым узроўні адукацыі. Адносіны паміж Крысцінай Барбарай і Казімірам Янам Сапегай былі заснаваны на павазе, узаемаразуменні і падтрымцы. Крыніцы таму пацвярджэнне – у найбольш значныя перыяды свайго жыцця і грамадскай дзейнасці яны згадваюцца разам.

Як вядома, 2006 год абвешчаны Годам маці. Хай і сённяшняе выступленне пра вядомых жанчын Заслаўя, якія занялі сваю нішу ў беларускай гісторыі, стане напамінкам пра святое, прыгожае і жыццядайнае, што ўвасоблена ў Жанчыне...

*Літаратура*


*1. Заяц Ю.А. Заславль в эпоху феодализма. Мн., 1995. – С. 124.*

*2. Заяц Ю.А. Заславль X – XVIII вв.: Историко-археологический очерк. Мн., 1987. – С. 54-55.*

*3. Малиновский И.А. Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого княжества Литовского, Томск, 1901. – С. 22-23.*

*4. Памяць. Заслаўе. Мн., 2000. – С. 70.*

*5. Тэстамент Яна Глябовіча, ваяводы троцкага. Пасляслоўе, пераклад і публікацыя А. Унучака // Спадчына, 2003, № 1. – С. 60-67.*

*6. Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku. Warszawa, 1895. – S. 591-594.*

*7. Rachuba A.. Kazimierz Jan Paweł // Dom Sapieżyński. Warszawa, 1995. – S. 336-356.*

*8. Polski słownik biograficzny. T. 43., 2004-2005. – S. 40-47.*



**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.



**Рэдкалегія: Сямашка К.У., Арцемьева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**



**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.